# РОЗА АДАМАЎНА ЗІНАВА (ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)



**15 лютага 2025 г.** споўнілася 90 гадоў з дня нараджэння **Розы Адамаўны Зінавай,** кандыдата геолага-мінералагічных навук (1972), старшага навуковага супрацоўніка, школьнага настаўніка вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

Р. А. Зінава (Сярмяжка) нарадзілася ў в. Старая Князеўка Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці. Скончыўшы з сярэбраным медалём Бярэзінскую сярэднюю школу № 1, у 1953 г. Роза Адамаўна паступае на геаграфічны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Жданава. Пасля заканчэння вучобы (1958) атрымлівае дыплом з адзнакай.

Жыццё і працоўная дзейнасць Розы Адамаўны падзяляецца на два перыяды: першы перыяд (1958–1973) звязаны з Казахстанам, другі (з 1973 г. па сённяшні дзень) – з яе радзімай, Беларуссю.

У 1958–1973 гг. Р. А. Зінава працавала ў Карагандзінскай пошукава-здымачнай экспедыцыі, спачатку на пасадзе старшага калектара, затым геолага. У перыяд з 1960 г. па 1973 г. працавала начальнікам тэматычных партый і атрадаў у складзе той жа экспедыцыі.

Сваімі работамі Р. А. Зінава ўнесла важкі ўклад у вывучэнне геалогіі кантынентальных кайназойскіх адкладаў Цэнтральнага Казахстана. Пры ўдзеле Р. А. Зінавай была складзена і апублікавана (1970) геалагічная карта маштабу 1 : 100 000 тэрыторыі Карагандзінскага вугальнага басейна і апублікавана манаграфія «Геология Карагандинского угольного бассейна» (1972). Р. А. Зінава займалася вывучэннем статыграфіі і палеагеаграфіі кайназойскіх адкладаў і вызначэннем мяжы паміж неагенам і атрапагенам у Цэнтральным Казахстане. Яна з’яўляецца аўтарам стратыграфічных схем па неагену і антрапагену Цэнтральнага Казахстана, зацверджаных на III Казахстанскай стратыграфічнай нарадзе ў 1986 г. і апублікаваных у г. Алматы ў 1996 г. Р. А. Зінава ўдзельнічала ў складанні геалагічнай карты маштабу 1 : 1 000 000 да XX тома «Геология СССР. Казахстан» (1971) і геалагічнай карты тэрыторыі Цэнтральнага Казахстана маштабу 1 : 500 000, у напісанні XXXIV тома «Гидрогеология СССР» (1970). Матэрыялы даследаванняў Розы Адамаўны па Цэнтральным Казахстане з’явіліся асновай кандыдацкай дысертацыі «Эаплейстацэн паўночнай часткі Цэнтральнага Казахстана і ніжняя мяжа антрапагену» (1972), якую яна выканала пад кіраўніцтвам прафесара К. У. Нікіфаравай, паступіўшы ў 1967 г. у завочную аспірантуру Геалагічнага інстытута АН СССР (Масква).

З лістапада 1973 г. пачалася праца Р. А. Зінавай у Беларусі. Яна стала старшым навуковым супрацоўнікам аддзела тэктонікі Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР, а ў 1978 г. была пераведзена ў лабараторыю геалогіі і палеапатамалогіі антрапагену, дзе працавала да ліпеня 2001 г.

Асноўны напрамак даследаванняў Р. А. Зінавай у час работы ў Беларусі – вывучэнне стратыграфіі кантынентальных адкладаў і палеаграфіі кайназою як на тэрыторыі Беларусі, так і на тэрыторыі Украіны, Прыбалтыкі, Казахстана, Заходняй Сібіры, Польшчы і Еўрапейскай часткі РСФСР, правядзенне карэляцый і вызначэнне стратыграфічных меж і палеагеаграфічных рубяжоў, у тым ліку з аддаленымі рэгіёнамі Тургая, Цэнтральнага Казахстана, Заходняй Сібіры. Р. А. Зінава актыўна ўдзельнічала ў даследаваннях па праекце МПГК № 41 «Мяжа паміж неагенам і чацвярцічнай сістэмай» (1976–1982).

З актыўным удзелам Розы Адамаўны праведзены буйныя міжнародныя навуковыя форумы. Шмат намаганняў яна прыклала для падрыхтоўкі і правядзення геалагічных экскурсій па Беларусі для ўдзельнікаў XI Міжнароднага кангрэса INQUA (1982) і XXVII Міжнароднага геалагічнага кангрэса (1984), VII Усесаюзнай нарады па краявых утварэннях мацерыковых зледзяненняў (1990).

Вялікі ўклад быў унесены Р. А. Зінавай у падрыхтоўку і правядзенне Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння акадэміка Г. І. Гарэцкага (2000). Яна вы-

ступала з дакладамі на канферэнцыі ў Мінску, у Кіеве ў НАН Украіны, у Маскве ў Геалагічным інстытуце РАН. Да 100-годдзя Г. І. Гарэцкага была апублікавана кніга «Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі. Успаміны, артыкулы, дакументы», укладальнікамі якой былі Р. Г. Гарэцкі і Р. А. Зінава.

Р. А. Зінава многія гады была пастаянным членам неагенавай і чацвярцічнай камісій МСК СССР і старшынёй неагенавай падсекцыі БелРМСК, адказным кіраўніком па складанні карэляцыйнай стратыграфічнай схемы неагенавых адкладаў Беларусі, прынятай на стратыграфічнай нарадзе ў Гомелі (1981).

У паслужным бібліяграфічным спісе Розы Адамаўны значыцца 120 навуковых прац, у тым ліку 4 манаграфіі (3 у суаўтарстве).

У 1988 г. Р. А. Зінава ўзнагароджана медалём «Ветэран працы».

Яшчэ адзін пласт дзейнасці Р. А. Зінавай – гэта педагагічная работа. З 1992 г. па 2007 г. яна працавала настаўніцай у мінскай гімназіі № 74, затым па 2010 г. у сярэдняй школе № 76. Розу Адамаўну высока цанілі як спецыяліста-педагога і вучні, і кіраўніцтва гэтых устаноў. Былыя вучні і настаўнікі не парываюць сувязь з Розай Адамоўнай па сённяшні дзень. Пішуць ёй, наведваюць яе. За педагагічную дзейнасць Роза Адамаўна адзначана ганаровымі граматамі Кастрычніцкага РАНА г. Мінска.

Вынікі навуковай, арганізацыйнай, грамадскай і педагагічнай працы Розы Адамаўны грунтуюцца перш за ўсё на яе высокім прафесіяналізме, валоданні шырокай інфармацыяй, вялікай працаздольнасці, а таксама прыцягальнасці яе як чалавека ў дзелавых і жыццёвых сітуацыях, абвостраным пачуцці справядлівасці, добразычлівасці і любові да людзей, жаданні ім дапамагчы, уменні схапіць сутнасць праблемы і ўбачыць найбольш спрыяльнае яе вырашэнне.

Зараз Р. А. Зінава на заслужаным адпачынку, але многа гадоў працягвала ўдзельнічаць у Гарэцкіх чытаннях, прысвечаных жыццю і творчасці братоў Гаўрылы і Максіма Гарэцкіх.

Былыя супрацоўнікі Інстытута геахіміі і геафізікі НАН Беларусі (зараз Дзяржаўнае прадпрыемства «НВЦ па геалогіі»), калегі і сябры Розы Адамаўны захавалі добрую памяць аб сумеснай працы і супрацоўніцтве і ў сувязі з юбілеем жадаюць ёй здароўя, шчасця, дабрабыту, аптымізму, светлых зямных радасцей.

*М. П. Аношка, Р. Г. Гарэцкі,*
*С. У. Дзямідава, рэдкалегія*